
Фотарэпартаж с Запустаў



На Запусты — вершаў густа. Каталіцкія Запусты (або Карнавал) звычайна суправаджаюцца маскарадамі, шэсцямі, гульнямі і традыцыйнымі стравамі. У Лучайскім касцёле св. Юды Тадэвуша свята ладзілася 10 лютага і прайшло без усіх вышэйпералічаных забаў. Але ад гэтага не стала менш яркім і запамінальным. Традыцыя адзначаць запусты з'явілася ў даўнія часы. Калі аснову эканомікі складала сельская гаспадарка, калі посту прытрымліваліся вельмі строга, а зімовы час даваў селяніну доўгачаканы адпачынак ад бясконцых турботаў, тады карнавал перад Вялікім постам быў самым бесклапотным перыядам у годзе. На сталах яшчэ панавалі тлустыя, мясныя стравы (нездарма існавала прыказка: "На запусты не хоча паньства капусты"), на двары не сціхалі песні і не спыняліся танцы.

Сучасныя каталікі і праваслаўныя не разгублялі старадаўніх традыцый, яны захоўваюцца ў 8шматлікіх хрысціянскіх гарадах і рэгіёнах. А часам адзначаюцца па-новаму…

У Лучаі заканчэнне карнавалу адбылося… музычна-паэтычным. Пасля Святой Імшы ў

касцёле выступілі вядомыя ў Беларусі і за яе межамі аўтары — паэт Леанід Дранько-Майсюк і паэт, бард Эдуард Акулін.

На Пастаўшчыне яны прэзентавалі свае творы ўпершыню. Леанід Васільевіч, паэт адметнага стылю, сапраўдны майстар беларускага слова, прачытаў свае вершы, у якіх прызнаўся ў каханні да Беларусі, мовы, жыцця.

— Мне вельмі прыемна выступаць перад вамі ў гэтых намоленых сценах, — звярнуўся паэт да прыхаджан, сярод якіх было нямала гасцей з іншых парафій. — Я наведаў бадай усе еўрапейскія сталіцы — быў у Афінах, Брусэлі, Парыжы, Берліне… Але заўсёды з вялікім задавальненнем прыязджаю ў вёску. Тут асаблівая атмасфера. Я вельмі рады, што мне пашчасціла пабываць у гэтых дзівосных мясцінах, на радзіме генія беларускай літаратуры Уладзіміра Дубоўкі. Спадзяюся, што сюды яшчэ давядзецца вярнуцца…

Самыя найлепшыя ўражанні ад Лучая засталіся і ў Эдуарда Акуліна. Яго выступленне выклікала непадробнае захапленне прысутных. Шчырыя пранізлівыя вершы, такія ж песні — так не хацелася, каб яны пераставалі гучаць! Дарэчы, адну з самых знакамітых песень барда — “Янка Купала” — прысутныя праспявалі разам.

Вершы і песні — не адзіныя падарункі, якія прывезлі з сабой сталічныя госці. Эдуард Акулін уручыў мясцоваму ксяндзу Мікалаю Ліпскаму дыскі з уласнымі песнямі, часопісы “Дзеяслоў” (бард працуе намеснікам рэдактара гэтага выдання), кнігі беларускіх паэтаў і публіцыстаў. Леанід Дранько-Майсюк пакінуў на памяць зборнікі сваіх твораў: раздаў і падпісаў іх усім жадаючым.

На памяць ад лучайцаў творцы атрымалі абразы заступніка парафіі — святога Тадэвуша і шматлікія словы ўдзячнасці.

Каля гадзіны лілася ў касцёле беларуская мова — сапраўдная, сакавітая, якую сёння так рэдка пачуеш… Мы, прысутныя, атрымалі вялікую асалоду ад яе незвычайна прыгожага, шчырага гучання. Дзякуй паэтам, якія знайшлі час наведаць пастаўскую глыбінку, і, безумоўна, арганізатарам — Таццяне Бензе і Мікалаю Ліпскаму — за магчымасць сустрэцца з надзвычай таленавітымі майстрамі роднага слова.

Іна СНЯЖКОВА.

Фота Альфрэда МІКУСА.